# Вечар
# над
# светам

**Бібліятэчка**
**Беларускага літаратурнага аб'яднання**
**„Белавежа"**

Серыя заснавана ў 1990

Кніга дваццаць трэцяя

Рэдактар Георгій Валкавыцкі

Copyright. © 1998 by Juryj Bajena

**ISBN 83-85918-15-9**

Юрый Баена

# Вечар над светам

Беласток 1998

* * *

Аддаляўса я ад вокнаў,
расчыненых уранні.
Ад хваляў
жыта з васількамі.
Ад бору
з тайнамі спрадвечнымі.
Ад песняў,
што трымцелі ў скронях.
Ад рэха —
яно журботна клікала...

Потым ужо быў вечар.
І ноч. І брэх сабак
Над светам.

## У НАШЫМ ДОМЕ

У нашым старым доме
Заўжды было шматлюдна:
Адны жылі ў ім на паверсе,
А мы — заўсёды ўнізе.

Аднойчы штосьці трэснула,
Нешта лопнула —
І паняслося рэха
Ад сцен,
Падлог,
Скляпенняў дома.

З той пары ў снах
З'яўляюцца прывіды:
Быццам сукватаранты
З паверха,
Як з вяршыняў,
Замест па лесвіцы,
Прама ідуць
Па нашых спінах...

* * *

Дабрыня і Праўда,
Як дзве крыніцы,
Якія прабіваюцца
З глыбінь зямнога шара,
Як дрэвы еднасці
У зялёным светлым лесе,
Як пара белых галубоў,
Што ў паднябеснай высі...

Аднак калі Праўду
Недзе ў травах схаваюць
Або ў крывым пакажуць люстры,
Суддзі яе асудзяць,
То, верце:
Дабрыня людская
Патаптанай будзе!...

## АДКАЗНАСЦЬ

Адказны я
за кожны крок,
за спеў душы,
за плач уначы,
за слова — жэст,
за Так і Не,
за ціхі боль,
каму, мабыць, учынены
ненаўмысна.

Апошнім часам
усё часцей
маўчу я —

І, быццам камень,
нясу сваю адказнасць
за маўчанне!...

## ПАД ВОСЕНЬ

У даліне ракі
крот точыць зямлю,
дакранае карэнняў траў,
лотаці і незабудак.

Побач ракі —
кусты каліны.
Тут тапалі,
вербы, алыныны.

Дрэвы варушаць кронамі,
птушынымі гнёздамі,
лісцем, як памяццю...

Аж рвецца
іх кроўная повязь!

Я
сцежкай каля ракі
іду-
Сум асенні нясу,
сваю боязь...

## ВОСЕНЬ

Трыццаць гадоў таму назад
наша вёска
танула ў мелодыях песняў...
Дваццаць гадоў таму назад
у кожнай хаце
раіліся мары...
Сёння — ціш...
Або глухі шум ветру.
Восень жоўтай лістотай
упрыгожвае сцежкі.
Мары ў магілах.
У марах — часцінкі сэрцаў.

Мы, маладыя беларусы,
ідзём наперад.
Пад нагамі залатыя лісты памяці
шалясцяць несціханай просьбай.

* * *

У вёсцы маіх прадзедаў
Нехта мяне вітае,
Аглядае дзівосным зрокам.
Нехта ўсміхаецца,
Абдымае рукамі жывымі
Або — з-за свету.

І кожны пытае,
Ці ведаю, хто ён.

Слухаю імёны і прозвішчы
Незнаёмых дзядоў і бабуляў.
Прыглядаюся тварам,
Шукаючы падабенстваў сваіх
І сяброў з дзяцінства.

А ці помніць хто-небудзь, —
Пытаю, —
Майго прадзеда Юзьвюка Васіля.

Я тут, —
Здалёку крычыць жаўнер,
Засыпаны ў траншэі...

* * *

Хтосьці прачэсвае лес.
Ля крыніцы каліна,
Над ракою шыпшына
Агнямі лунаюць.

Пры дарозе, як фрэскі,
Асыпаюцца кветкі.
Ідзем мы міма.

У паветры звіняць травы.
Стынуць гукі і словы,
Сціхаюць размовы.

Цераз імглу і пыл,
Цераз горкі дым
Ідзем.
Ідзем маўкліва.

Зрэдчас, быццам выгнанец,
Сёй - той
Назад пагляне...

## БЯРОЗЫ ДЫ СОСНЫ

Бярозы ды сосны —
браты і сёстры
па схілах узвышша
ўгору ўзнімаліся.

Птушкі на галінках
ім песні спявалі,
у зялёных каронах
свае гнёзды вілі.

Раптам старыя дрэвы
спыніліся...

Маладыя ішлі далей,
вышэй ды вышэй,
назад не азіраліся —

Калі вятры
ўсё галлё паламалі,
крыжамі яны сталі.

## МУР

Паміж рэчаіснасцю
і маімі снамі
будуецца мур.
Узводзіцца вольна,
засланяючы святло
маіх сноў.

Няма ў мяне сіл,
ні способу,
каб паваліць яго,
каб разбурыць.

Усё вышэй ды вышэй
узнімаецца мур —
недалёкі ўжо час,
калі ён
будзе ў нябёсах...

## СЦЯНА

Першы дзень — пільнавалі сцяну.
Другі дзень — бялілі сцяну.
Трэці дзень — пакрывалі сцяну
Чорнай маззю.

У тую ноч,
Калі спалі ўсе маляры,
Нехта сцяну
Аганьком асвяціў
І ўбачыгў,
Як на фоне святым
Ізноў ажывалі фрэскі.

## КАМ ЕНЬ

Гэты камень у бруку
маўчыць галасней,
чым я.

Мажліва, што і я
буду маўчаць як камень,

калі стануць таптаць
мяне, як брук.

* * *

На каменную пліту
ўпалі слёзы.
Слёзы развеяў вецер.
Камень
        астаўся
                каменем.

**ДЫКТАТАР**

Агульнавядомы дыктатар
Узяў у руку аловак,
Водзіць ім па карце...

Будуць трываць у страху
Айчыны нямыя.
Малыя.
Свае — нічые — чужыя!

## КРЫК УНУТРЫ

Некалі хтосьці
Расказваў пра чалавека,
Які без знаку голасу
У час паражэння токам
У глыбіні сваёй істоты
Крычаў нясцерпным болем —
Аж разарвалася сэрца.

Сябры,
Калі б енк пачулі,
Прыбеглі б,
Ратавалі б друга.
А так —
Пагас у муках,
Самотны за сцяною...

З той пары
Ў хвіліны смутку і адчаю
Думаю
Пра незнаёмага чалавека —
Бездапаможны ён,
Крычаў усёй душою!...

## У ПАМІРАЮЧАЙ ВЁСЦЫ

У паміраючай вёсцы
адзін толькі месяц
штовечар кагосьці чакае
штоноч кагосьці шукае
срэбрыць хаты і дрэвы
пустыя сцежкі і вуліцу
ціхія панадворкі
камяні халодныя
і лавачкі

Глядзіць
з вышыні пяшчотна
зрокам учарашнім

## ПАКЛОН

Кланяюся
саснаваму лесу,
гамонкай дуброве,
празрыстай рэчцы,
густому чароту,
пыльнай дарозе
ў спякоце лета.

Кланяюся вам,
родная вёска,
палёў прастора,
сінь незабудкаў
на дыване луга,
бярозкі стройныя
на вотчыне мілай...

З дзесятага паверха
паўхмарачоса
гляджу ў ваш бок,
ваш сын і брат
з вялікага горада
Беластока!...

## НЯКІДКІЯ

Рашылі не пакідаць нічога,
што прыпаміналa б ім даўні час.
Вынеслі ўсё пад тапор:
куфры, сталы, партрэты.

Вецер стукоча аканіцамі душ.
Зсллe сцяною закрывае вочы.

Някідкія, з тэатральным „л",
прагнуць сыграць яшчэ
(свядома, або і не)
некалькі галоўных
канкрэтна неназваных роляў —
камічных?
драматычных?
якіх?

## КАПРАЛЫ

Многае ў гісторыі свету
не выйшла б,
калі б не было
дастатковага ліку капралаў.

Каб змагацца,
проста іх трэба мець
падрыхтаваных,
адданых,
нацэленых.

У капралаў — поўны аптымізм.
Асабліва тады,
калі аптымізму няшмат у народзе.

Капралы, вядома, у атаку вядуць,
гневам дасягаюць мэту...

Нярэдка
за сабой
пакідаюць толькі
клубы пылу.

* * *

Моцныя народы, як сабакі, кідаюцца
ў абароне сваёй годнасці.

Беларусы толькі пытаюць: навошта?

## ВЫБАР

Калі ад болю сэрца
хочацца табе выць,
маўчыш.
Або робіш гэта ціха.

Калі ідзем за кругагляд,
на другі бераг ракі,
мабыць, і не думаеш
пра сваё вяртанне.

Калі на гонях
траянскія коні пасуцца,
чаму, здаецца,
іх не прагоніш.

Зло спараджае зло,
а ты яго
быццам і не бачыш...

Аднак, калі трэба
быць сабой, беларусам,
калі няма выбару,
устань
і на сваю адказнасць
пакажы яшчэ
ч а л а в е ч н а с ц ь .

## НА МЯЖЫ

Палыны займаюць край.
Шчыльна стаіць народ
ужо ля брамы.

Чужыя варты
правяраюць дакументы,
зазіраюць у вочы,
поўзаюць па сэрцах,
выварочваюць памяць...

Змалку
на дне душы
нясу айчынны скарб —
матчын дар...

І не іду ў чаргу
да тых,
хто ціха
пакідае край!...

* * *

Былі
гаварылі штосьці

Выехалі

Потым надышла зіма
стагоддзя

Снег засыпаў
усе пераходы
да дому
мароз замарозіў
вокны

Вясной
прыляцела еўропа
на камені села

задумалася

**АНКЕТА**

Так
не
не ведаю
не памятаю
хачу падумаць
прыпомніць
рыска
жыву
зусім звычайна
нармальна
калі нехта
пастукае ў дзверы
адкрываю
калі ласка
заходзьце ў дом
гутарым
да канца размовы
не паказваю пальцам
ні на ўсход
ні на захад
нікому не замінаю
быць чалавекам
у Бельску

* * *

Словы,
якія з крыкам
уварваліся ў гісторыю,
застылі на плітах помнікаў.

Іншыя змоўклі
(ад душэўнай прагі)
або ападаюць
з паламанымі крыламі.

Жывая памяць
не раз нечакана бурыцца.

Падымае рукі,
камяні з аглухлых вулічак...

**СЛОВЫ І ГОРЫ**

Ёсць многа слоў
на Зямлі
вышэйшых за горы
цяжэйшых
за скалы

Ёсць словы
ёсць горы

Без слоў
падымаюся
над прорвай

## ПАЭЗІЯ

Ізаляваны — не крычу.
Самотны — не гілачу.
Ты, аднак,
Заўсёды прысутная —
Нябачная
Шчыліна ў сцяне.

## ЦЕНІ

Цень дзіцяці і цень старога —
доўгія два цені.
З сабой яны злучаюцца
ўвечары жыцця і ранкам.
Першы цень — гэта цікавасць свету
і надзея.
Другі, як белы птах ці казка,
заўжды ўспаміны будзіць,
што асталіся за фіранкай.
Крок за крокам, паміж двума ценямі,
я ўвайшоў з двухкрылым ценем:
з правам,
каб да крыніц сваіх вяртацца,
і з абавязкам,
каб дасканаліцца ў тварэнні.

## НА ВАКЗАЛЕ ЧУЖОГА ГОРАДА

*жонцы прысвячаю*

Позні вечар.
Стаю на вакзале
Чужога горада.
Праліўны дождж
Балюча сячэ мой твар.
Журботна тут,
Холадна ды сонна...

Першая адначасна з другой,
Пятая з шостай,
Дзевятая з дзесятай
Яснеюць рэйкі.

Дзве з іх напэўна да цябе,
Каханая.

* * *

Стаю непарушна,
Павярнуўшыся ў бок дня.
Гляджу ў бязмежную даль.
А там толькі імгла...

Людзі, што побач, як карусель,
Кружацца ў замеці —
Налева, направа бягуць,
Шчасце - няшчасце хапаюць рукамі,
Нясуць...

Вецер зрывае з дуба лісцё
І з трэскам ломіць сухое галлё...

Ужо
У закавулках майго паліто...

Соўваю нос
У попельнік сноў —

Прыйдзецца, хіба, чакаць
Прадвесня?

## ХАДЖУ ПА КАНАЦЕ

Хаджу па канаце

Кожная няўвага
памылка
ці спатыкненне
ў лепшым выпадку
скончыцца
паламаннем ног

Рацыянальна глянуўшы
няма выхаду

Калі раней
быў такі выбар

* * *

Перасоўваючыся
па дошцы шахматнай,
губляю дні і ночы,
і гады цэлыя.

Па дарозе
крутой і простай
выглядаю тэатра,
у якім здзейсню задумы.

У пагоні за часам
і зямлёй пад нагамі
пакідаю ўсё новыя тэатры.

Здаецца,
заўжды ў далонях
выношу недаспелыя яблыкі...

## ЗАТОР

Калі напрадвесні
зямлю сагрэе сонца,
а на замёрзлай рацэ
творыцца ледзяны затор
і ў яго напружанні
расце пагроза,

не кожная кропля вады,
не кожны абломак лёду
хочуць астацца
ў абалонні паводкі.

## СЕМЯНОЎСКАЕ ВОЗЕРА

Хадзі, дружа,
паглядзім,
як хвалюецца возера.
Пастаім у цішыні,
у задуменні,
аж пачуем з бяздоння
трывожнае рэха...
затопленай спадчыны.

* * *

Побач разгалістай сасны
тры крыжы.
Палявы граніт.
Камень пры камені.

Пальцамі жывой рукі
дакранаю кірыліцы.

Як сляпы —
шукаю рук,
вачэй Маці...

* * *

З рэха
абарончых бітваў
з крыку
без адказаў
з ціхай роспачы
айчыннай
са слоў надзеі
паўшых —

малыя дні
будучыня наша
вечнасць?

* * *

Будзь чужы
сярод непрыязных чужых.
Будзь самотны
сярод абыякавых сваіх.
Будзь сабою.
Нязломны
аж да болю...

Калі памяць твая
жыве,
Калі кліч Айчыны
нясеш!

* * *

Спрадвечным словам
трэба жыць,
міма пагроз,
што будуць растаптаныя,
пазваныя на смерць
праз забыццё
і здраду.

Спрадвечным словам
трэба быць
сярод гнязда
разбуранага ветрам,
і мар зламаных,
і душ патрэсканых
у бітвах.

Спрадвечным словам
трэба быць у нас,
трываць
як святасць
або храм,
што адраджаецца
ў малітвах.

## ВЫРАТАВАННЕ РОДНАЙ МОВЫ

Выратаваць мову бацькоў —
гэта значыць: засланіць яе грудзьмі
ад замеці, пажараў,
паводкі і бур'яну...

Гэта значыць: адчыніць ёй дзверы
ў кожны новы дом,
у кожны пакой, салон,
вялікія, як сэрцы.

Выратаванне мовы —
гэта прага, каб паслухаць,
як словы родныя, пявучыя
жывуць,
красуюцца на вуснах сына
і ў мудрых гутарках унукаў.

* * *

Адбудаваць трэба наш дом:
Камень паставіць пры камені.

Вачам — адкрыць усе вокны,
Словам — аднавіць крыніцы.

Не выстаіць дом без даху,
Без святасці і памяці,
Без вогнішча,
Надзеі - ветразя...

Увайшоўшы ў такі дом,
Нават вораг
Каля парога скіне боты.

## ЗАЎТРА

Усё прадбачлівае і нязнанае
здарыцца можа заўтра,
паслязаўтра
або крыху пазней —
так не адзін
год за годам
мінае ў снах.

„Заўтра" — гэта значыць „заўсёды",
або „ніколі".
Два супрацьлеглыя словы
змагаюцца за права
на вечнасць.

Многае зямное адбываецца
па-за нашым прадбачаннем,
без ніякай патрэбы
і без дазволу.

Таму
сны і мары,
як знакі свабоды,
апраўдваюць змаганні,

каб дарэшты
не паддацца
капрызам лёсу.

* * *

Недапетую песню — даспявай.
Недазбіранае — дазбірай.
Несказанае — да канца — скажы.

Толькі крокаў сваіх — не лічы.
Толькі думак сваіх — не тушы.

Веру — жывым перадай.
Веру жывую — пакінь!

**ЗМЕСТ**

* * * Аддаляўся я ад вокнаў
У нашым доме
* * * Дабрыня і Праўда
Адказнасць
Пад восень
Восень
* * * У вёсцы маіх прадзедаў
* * * Хтосьці прачэсвае лес
Бярозы ды сосны
Мур
Сцяна
Камень
* * * На каменную пліту
Дыктатар
Крыкунутры
У паміраючай вёсцы
Паклон
Някідкія
Капралы
* * * Моцныя народы, як сабакі, кідаюцца .
Выбар
На мяжы
* * * Былі
Анкета
* * * Словы
Словы і горы
Паэзія
Цені
На вакзале чужога горада
* * * Стаю непарушна
Хаджу па канаце
* * * Перасоўваючыся
Затор
Семяноўскае возера
* * * Побач разгалістай сасны
* * * З рэха
* * * Будзь чужы
* * * Спрадвечным словам
Выратаванне роднай мовы
* * * Адбудаваць трэба наш дом
Заўтра
* * * Недапетую песню — даспявай

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год